Ба22564

Максім Танк



# Галінка і верабей

БССР
імені
ЛЕНІНА

Мінск Саюздрук
1946

Ба 22564

Максім Танк

# ГАЛІНКА І ВЕРАБЕЙ

Бел. аддзелне. 1953 г.
1994 г.

САЮЗДРУК
МІНСК 1946

Мал. В. Мазурава

АТ. 30241. Падпісана да друку 21/VIII—1946 г.
Друкарня ім. Сталіна, Мінск, Пушкіна, 55. З. 247

25. 04. 2009

# Галінка і верабей



— Галінка-вярбінка, —
Прасіў верабей, —
Мо‘ пакалыхала-б
Маіх ты дзяцей?

Галінка не хоча
Дзяцей калыхаць.
— Ідзіце, казулі,
Галінку ламаць!



Казулі не хочуць.
— Ідзіце-ж, ваўкі,
Лавіце, карацці
Казуляў такіх,

Якія не хочуць
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць!



Ваўкі не схацелі.
— Прыходзьце стральцы,
Каб непаслухмяных
Ваўкоў правучыць.

Якія не хочуць
Казуляў карацць,
Якія ляняцца
Галінку ламаць,



Якая не хоча
Дзяцей калыхаць!
Пайшлі паляўнічыя
У лес на ваўкоў,

Спалохана зверы
Пабеглі з дуброў.
Пабеглі казуляў
Лавіць і карацы,



Казулі пабеглі
Галінку ламаць,
Галінка-ж вярбінка
Са страху хутчэй

Давай калыхаць
Вераб'іных дзяцей.
З тых дзён без спачынку,
Каб кожны быў рад,
Калыша Галінка
Усіх птушанят.





Інв. 1953 г.

a

Цана 50 кап.

B00000002765924

Бел. аддзел
1994 г.

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ
Максим Танк
ВЕТКА И ВОРОБЕЙ
Союзпечать
Минск 1946